СУСТРЭЧЫ

З ЛЮБОЎЮ ДА РОДНАГА СЛОВА

У гімназіі № 6 імя Ф. Э. Дзяржынскага выступіла пісьменніца Людміла Кебіч.

У межах Тыдня пачатковай школы і рэалізацыі літаратурна-адукацыйнага праекта «Жывое слова: урокі з пісьменнікамі» ў гімназіі № 6 імя Ф. Э. Дзяржынскага адбылося пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «З любоўю да роднага слова». Госцем мерапрыемства стала вядомая гродзенская паэтка, празаік, перакладчык, старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Людміла Кебіч.



Сустрэча з вучнямі 3-4 класаў атрымалася менавіта такой, як і было задумана: шчырай і цёплай — такой жа светлай, як усмешка Людмілы Антонаўны. Пісьменніца расказала дзецям пра свой шлях у літаратурную творчасць і здзівіла ўсіх тым, што вершы пачала пісаць яшчэ ў першым класе!

Падчас сустрэчы Людміла Кебіч пазнаёміла вучняў са сваімі кнігамі для дзяцей і зацікавіла сюжэтам новай кнігі «Як коцікі-брацікі малую Радзіму шукалі». Асаблівую ўвагу пісьменніца надала вершам з новага зборніка твораў для дзяцей «Котка Вуска-беларуска». Гэтыя творы прасякнуты любоўю да роднага краю, яго гісторыі; павагай да дзяржаўных, нацыянальных сімвалаў і народных традыцый. У вершах дзеці пачулі пра беларускую касманаўтку Марыну Васілеўскую, працавітую дзяўчынку і запаслівага хлопчыка, пра колеры нашага сцяга, школу і правілы паводзін, а нават пра самыя любімыя святы. Наступная кніга «Чароўны куфэрак часу» пазнаёміла маленькіх чытачоў з жанрам фэнтэзі і адкрыла цікавы свет беларускага нацыянальнага ўзору. Прадставіла Людміла Антонаўна і аўтабіяграфічную аповесць пра падлеткаў «Дамінанты лёсу». А кніга «Бэрак, бэрак, дай цукерак» здзівіла гімназістаў чароўнымі істотамі з беларускай міфалогіі.

Атмасферу мерапрыемства саграваля шчырая ўсмешка аўтара. У якасці прыемнай неспадзянкі вучні прачыталі верш Людмілы Кебіч «Лепшы горад зямлі» на памяць.



Напрыканцы сустрэчы дзеці з цікавасцю пыталіся ў пісьменніцы, якая з яе кніг самая любімая, і выказвалі аўтару добрыя пажаданні. Менавіта такія сустрэчы – цёплыя і запамінальныя – і робяць слова жывым, а любоў да роднай мовы перадаюць ад сэрца ў сэрца.

Юлія ЧАМЯРЫС
пісьменніца-педагог,
кіраўнік Гродзенскага гарадскога
літаратурнага аб'яднання «Надзея»,
ініцыятар і куратар праекта
«Жывое слова: урокі з пісьменнікамі»

На здымках: у гасцях у навучэнцаў гімназіі № 6 імя Ф. Э. Дзяржынскага г. Гродна – старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Людміла Кебіч. Лістапад 2026 года.




Літаратурная
гасцёўня
да
дня слова"


ЯК КОЦІКІ-БРАЦІКІ
МАЛУЮ РАДЗІМУ
ШУКАЛІ
«Слова —
ота ключ
до серця
чалавека»


ВЭРАК ВЭРАК
Дай цукерку


БЭРАК, БЭРАК,
дай цукерак!




Людміла КЕБІЧ
ДАМІНАНТЫ ЛЁСУ
Людміла Кебіч
КОТКА ВУСКА – БЕЛАРУСКА
Людміла Кебіч
ЯК КОЦІКІ-БРАЦІКІ МАЛЮЮ РАДЗІМУ ШУКАЛІ
Людміла Кебіч
ЧАРОЎНЫ КУФЭРАК ЧАСУ


Літаратурная
гасцёўня
"З любоўю да
роднага слова"


Школьный


Людміла Кебіч
ДАМІНАНТЫ ЛЁСУ
аповесць
Людміла Кебіч





Государственное учреждение образования
«Гимназия №6
имени Ф.Э.Дзержинского г.Гродно»

ГVI

www.pisateli.by